Рабочы аркуш да абагульняючага ўрока па раздзеле
“Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія”

**Заданне 1.** Прачытайце прыказкі і вызначце, якой тэмай яны аб’яднаныя. Падлічыце і запішыце колькасць гукаў [ш] у прапанаваных прыказках.

| Прыказка | Колькасць [ш] |
|---|---|
| 1. Што ведаеш, насіць няцяжка. | |
| 2. Чужым розумам не пражывеш. | |
| 3. Кніжка чалавеку, што ліпа пчолцы. | |
| 4. Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей. | |
| 5. Лепш з разумным згубіць, чым з дурнем знайсці. | |

| | | |
|---|---|---|
| без памылак | 1-2 памылкі | 3 і больш памылак |

**Заданне 2.** Злучыце патрэбныя часткі прыказак паміж сабой. Падкрэсіце ў прыказках словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.

| | | |
|---|---|---|
| 1. Няма лепшай вадзіцы, | | як зморанаму пасцелька. |
| 2. Родная зямелька – | | сваё гняздо бароніць. |
| 3. Далёкая старонка | | і камар загіне. |
| 4. Усякая птушка | | як з роднай крыніцы. |
| 5. На чужыне | | без ветру сушыць. |

| | | |
|---|---|---|
| без памылак | 1-2 памылкі | 3 і больш памылак |

**Заданне 3.** Аднавіце прыказкі, замяніўшы малюнкі словамі. У словах, якімі вы замянілі малюнкі, падкрэсліце літары, якія абазначаюць санорныя гукі.

| Прыказка | Слова |
|---|---|
| 1. У гультая і  цячэ, і печ не пячэ. | |
| 2. Слоў , а спраў на вяршок. | |
| 3. Хто свята шукае, той  латае. | |
| 4. З  хлеб невялікі, а з гулякі – ніякі. | |
| 5. Найсмачнейшы  ад сваёй працы. | |

| | | |
|---|---|---|
| без памылак | 1-2 памылкі | 3 і больш памылак |

**Заданне 4.** Выпраўце памылкі, напісаўшы словы, якія трэба ўжываць замест памылковых. Сярод запісаных слоў, знайдзіце тое, у якім назіраецца аглушэнне звонкага зычнага на канцы слова, і падкрэсліце яго.

| Прыказка | Слова |
|---|---|
| 1. Нашто лепшы шакалад, калі ў дзецях лад. | |
| 2. Старога паважай, старую павучай. | |
| 3. Дзе стары бурчыць, малады крычыць. | |
| 4. Хто бацькоў зневажае, той цукерак не знае. | |
| 5. Бацькавы рукі заўсёды мяккія. | |

| | | |
|---|---|---|
| без памылак | 1-2 памылкі | 3 і больш памылак |

**Заданне 5.** Прачытайце тэкст, выберыце патрэбныя літары з прапанаваных у дужках.

Я ся(ж, дж)у на крэсле каля ло(ш, ж)ка, а на ло(ш, ж)ку л(я, е)жыць накрыты ко(в, у, ў)драю Міця. Пад яго галавою горка падушак, падушка л(я, е)жыць і на яго гру(д, дз)іне. На ёй – разгорнуты (с, ш)шытак. Мы рашаем задачу – на пя(т, ц)ь ці на шэс(т, ц)ь дзея(н,нн)яў. Калі я не пачу(ў, у, л) Міцевага голасу, падня(ў, у, л) галаву, адарва(ў, у, в)шы позірк ад свайго (с, ш)шытка, што ляжа(ў, у, л) на кале(нн, н)ях, дык убачы(ў, у, л): Міця, закіну(ў, у, в)шы галаву, ляжыць з заплюшчанымі вачыма. Ло(п, б), шчокі яго ссінелыя, (в, -)очы запалыя, (в, -)усны пасмяглыя, і таксама быццам пасінелыя, шыя худая, з (в, -)острым кадыком. Краёк гру(д, дз)іны, што віда(т, ц)ь праз расхінутую ля горла кашулю, белы-белы, як вымазаны крэйдаю.

1. Новых сяброў нажывай, але старых не забывай.
2. Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбаю.
3. Шукай сабе сябра ў бядзе.
4. І службу служы, і сябру дапамажы.
5. Прыяцеля за грошы не купіш.

| | | |
|---|---|---|
| без памылак | не больш за 5 памылак | 6 і больш памылак |

## ***Мая адзнака за ўрок***

☐ X 5 =______

☐ X 3 =______

☐ X 1 =______

| *Балы* | *Адзнака* | *Балы* | *Адзнака* |
|---|---|---|---|
| *24-25* | *10* | *14-16* | *6* |
| *22-23* | *9* | *12-13* | *5* |
| *19-21* | *8* | *9-11* | *4* |
| *17-18* | *7* | *8 і менш* | *3* |

Усяго ☐ балаў

Мая адзнака ☐